

Жыве Беларусь!

Народная газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№53-54 (1070-1071) 22 сакавіка 1995 г. Серада. Выдаецца з кастрычніка 1990 года на беларускай і рускай мовах. Тыраж 558399 экз. Кошт у розніцу — 200 руб.



Вкратце

Президент США Билл Клинтон посетит Киев с официальным визитом 10—11 мая.

Б.Клинтон письменно проинформировал Бориса Ельцина о решении прибыть в Москву 9 мая для участия в торжествах по случаю 50-летия Победы над фашизмом. Кроме того, президент США подтвердил свое согласие принять 11 мая участие в двусторонних российско-американских переговорах.

❑

Основная часть тяжелых вооружений дудаевских формирований либо уничтожена, либо захвачена федеральными вооруженными силами. В этих условиях возрастает возможность перевести процесс ликвидации конфликта на мирные рельсы, избежав боевых действий в городах и населенных пунктах Чечни, считает секретарь Совета безопасности РФ Олег Лобов.

❑

По предварительным данным, 35 боевиков таджикской оппозиции убито при попытке переправы из Афганистана в Таджикистан через пограничную реку Пяндж вечером 20 марта на участке 10-й заставы Пянджского погранотряда.

Огнем артиллерии переправа была уничтожена, часть боевиков вернулась на сопредельную территорию. Среди российских пограничников потерь нет.

❑

Курс российского рубля по отношению к доллару США на торгах Московской межбанковской валютной биржи во вторник упал на 17 пунктов по сравнению с торгами в понедельник и составил 4824 рубля.

❑

Принять экстраординарные меры по спасению телекомпании "Останкино" призвал российское правительство председатель подкомитета Комитета по информационной политике и связи Государственной думы РФ Игорь Яковенко (фракция "ЯБЛоко").

И.Яковенко заявил, что передача "Останкино" только 9% акций АО "Общественное российское телевидение" делает старейшую телекомпанию "фактически бесправной" в процессе акционирования телевидения. И.Яковенко считает, что "Останкино" должен принадлежать контрольный пакет акций ОРТ. Он подчеркнул, что решение о создании ОРТ принималось "тайно, келейно, узким кругом лиц".

❑

В Приморском крае (Дальний Восток) арестован счет регионального филиала финансовой компании "Русский Дом Селенга".

Арест счета был вызван множеством исков, поданных в суд от вкладчиков "РДС". Только в одном из районных судов Владивостока их насчитывается около пятисот. В среднем сумма одного иска от вкладчиков составляет 8 миллионов рублей, а на счету филиала "РДС" всего 140 миллионов.

Их осталось только 311

Еще пять депутатов Верховного Совета Беларуси сложили 20 марта свои полномочия.

Среди них — Михаил Комар и Владимир Зарецкий, которые возглавили президентские администрации в Рогачеве и Чечерске. В связи с назначением Владимира Слесарева первым заместителем председателя Гомельского облисполкома он также лишился депутатского мандата, как и Франц Минько — по причине назначения его заместителем министра сельского хозяйства и продовольствия. В соответствии с п. 8 ст. 95 Закона "О Верховном Совете Республики Беларусь" (утрата белорусского гражданства) сложил депутатские полномочия Владимир Коваленок. Последнее, кстати, стало причиной для того, чтобы вспомнить еще одного парламентария без гражданства. Речь идет о после Республики Беларусь в Российской Федерации г-не Даниленко. Однако вопрос о сложении им депутатских полномочий пока отложен.

Еще один кадровый вопрос касался назначения третьего заместителя Председателя Верховного Совета, должность которого после ухода в правительство Владимира Русакевича оказалась вакантной. Президиум ВС предложил на это место Зинаиду Пенькову. Но после долгих споров парламент вообще снял этот вопрос с повестки дня, мотивировав это нецелесообразностью, поскольку "Верховному Совету остается работать несколько дней".

Юрий ЛЕШКЕВИЧ.

Тяжела ноша Нацбанка

17 марта 1995 года Национальный банк Беларуси отправил руководителям коммерческих банков и начальникам главных управлений НБ Республики Беларусь телеграмму следующего содержания:

"В связи с продолжающимся высоким уровнем инфляции Национальный банк сохраняет до 20 апреля учетную ставку по централизованным кредитным ресурсам в размере 25% в месяц, обязательную минимальную ставку по вновь заключаемым банками договорам по срочным депозитам — 25%, по депозитам до востребования — 10% в месяц".

В то же время, по расчетам НБ, инфляция за февраль составила 33,7%. Следовательно, централизованные ресурсы по-прежнему остаются относительно дешевыми. Предыдущие 2 месяца показали, что, к сожалению, коммерческие банки не могут работать на ставке рефинансирования, близкой к реальным темпам инфляции, поэтому основной груз борьбы с последней вновь взвалил на себя Нацбанк.

Сергей ВЕРАС.

Конец карьеры Александра Курловича?

33-летний четырехкратный чемпион мира в супертяжелой весовой категории А.Курлович сейчас серьезно подозревается, как сообщает информированная германская газета "Зюддойче цайтунг", в применении допинга.

У белорусского тяжелоатлета, выступающего ныне за команду высшей лиги ФРГ "Замсвеген", в конце января в Берлине после выступления на помосте была взята допинг-проба. Исследование "пробы А" производил Вольфганг Петер, председатель медицинской комиссии Всемирной федерации тяжелой атлетики. И результаты проверки оказались положительными.

И теперь уже известный германский биохимик из Кельна профессор Манфред Донике проведет исследование контрольной "пробы В", чтобы либо подтвердить первый результат, либо его опровергнуть. Однако, как считают специалисты, крайне редко итоги повторного исследования отличаются от первого.

И сейчас над А.Курловичем, белорусом польского происхождения, физиком по специальности, нависла угроза лишения права выступать на помосте. Поэтому он решил лично присутствовать при повторном анализе, который проведет кельнский ученый.

Газета вспоминает инцидент, который произошел с тяжелоатлетом в уже далеком 1985 году в Канаде. Тогда таможенники задержали А.Курловича с чемоданом, наполненным анаболическими стероидами на сумму в 35 тысяч немецких марок. Бывшая советская федерация тяжелой атлетики дисквалифицировала его пожизненно, однако через два года он опять начал выступать, "помилованный" функционерами от спорта.

Не прячьте драгоценности по банкам и углам

Учитывая заинтересованность населения, Министерством торговли страны проведена работа по организации приемки от граждан и продажи ювелирных изделий и драгоценных камней через комиссионные антикварные магазины и отделы.

Так, в феврале АП "Камісійная лаўка" (г.Минск) заключила договор с фирмой ООО "Джи МА Интерпрайз" и с помощью современного оборудования и высококвалифицированных специалистов впервые в Беларуси приступила к приемке от населения ювелирных изделий со вставками из бриллиантов. По мнению специалистов, данные меры позволят пополнить рынок страны высокохудожественными ювелирными изделиями из драгоценных металлов со вставками из камней, а также удовлетворить запросы покупателей.

Сергей РАСОЛЬКО.

В войсках — эксперимент

В отдельных частях Вооруженных Сил Беларуси начался эксперимент на предмет приживаемости некоторых нововведений. Например, в одном из полков 120-й дивизии военнослужащих срочной службы, не задействованных в нарядах и дежурствах, в выходные и праздничные дни отпускают домой.

В 38-й бригаде, что в Бресте, пошли еще дальше. Здесь претерпел изменения и распорядок дня. Так, физическую зарядку упразднили, а подъем сделали на полчаса позже. Но о физической подготовке не забыли — она проводится ежедневно с 8.00 до 9.30. Занятий в день стало больше (вместо шести часов — семь). Сместилось и время проведения развода караулов и внутреннего наряда — с 18 часов на 13.00.

И самое главное нововведение — изменение порядка увольнения солдат и сержантов. В увольнение уходят не 30 процентов личного состава, как это практиковалось ранее, а все, кроме наряда. Единственное условие увольнения — хорошая успеваемость и дисциплина. Вот и выходит, что бригада с 15.00 в субботу до 21.00 в воскресенье практически пустует.

Пресс-служба Министерства обороны.

Белорусский реформатор европейского уровня

В Национальной библиотеке Республики Беларусь открылась книжная выставка "Некоронованный король", посвященная 480-летию со дня рождения Николая Радзивилла Черного (1515 — 1565).

Радивилл Черный известен не только как первый несвижский князь, но и как прославленный государственный деятель Великого княжества Литовского и меценат белорусского искусства. В результате реформаторской деятельности "некоронованного короля" — принятия кальвинизма, поддержки униатских изобразительных и музыкальных искусств, основания типографии и библиотеки — Великое княжество Литовское активно включилось в процессы европейского Возрождения.

Выставка знакомит зрителей с материалами о деятельности Радзивилла Черного, истории его жизни. В экспозиции представлены подлинные книги XVI века, изданные брестской радзивилловской типографией.

Ирина КОЛОМЕНСКАЯ.

В местных парламентах попросторнеет

Народных избранников Бреста и области станет после выборов в два раза меньше.

Сессии гор- и облисполкома решили, что с лета интересы горожан будут представлять 44 депутата, жителей области — 92.

Василий ВИКТОРОВИЧ.

Почем валюта?

С 22 марта 1995 года Национальным банком установлены курсы иностранных валют

Единый курс	
1 австрал. доллар	8450.40
1 австр. шиллинг	1182.37
1 фунт стерлингов	18433.11
10 бельг. франков	4032.48
1 немецкая марка	8322.04
1 голланд. гульден	7420.83
1 датская крона	2075.59
100 итальянск. лир	673.40
1 канадск. доллар	8300.73
1 норвежск. крона	1863.32
1 доллар США	11670.00
1 финск. марка	2659.71
1 франц. франк	2341.96
1 шведск. крона	1610.10
1 швейцар. франк	9995.72
10 японских иен	1306.68
1 ЭКЮ	15130.30
10 испанск. песет	906.20
10 греч. драхм	507.39
1 ирландск. фунт	18453.51
1 исландск. крона	181.35
1 кувейт. динар	39465.67
10 ливанск. фунтов	71.33
10 португал. эскудо	787.72
1 сингапур. доллар	8259.61
10 турецк. лир	2.78
1 СДР	17992.00
1 эстонск. крона	1049.46
1 росс. рубль	2.40
10 укр. карбованцев	0.84
1 литовский лит	2917.00
1 латвийск. лат	22450.00
1 кыргызск. сом	1075.00
1 молдавск. лей	2640.00
1 казахст. тенге	150.00
1 армянск. драм	18.00
10 грузинск. купонов	0.02
1 туркменск. манат	200.00
1 азербайджан. манат	2.00
1 узбекский сум	60.00
1 таджикский рубль	0.01
Курс клиринговых валют	
1 доллар США по расчетам с Кубой	11670.00
1 доллар США по расчетам с Чехией и Словакией	11670.00

Выпуск подготовлен по сообщениям корреспондентов "Народной газеты", агентств ИТАР—ТАСС, Белинформ, Интерфакс, БелаПАН, РИД.

Скоро референдум?





Фото Сергея БРУШКО и Василия ТИТОВА.

НА СЕСІІ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

"Справу Сярэдзіча" спусцілі на тармазах?

Алег ГРУЗДЗІЛОВІЧ

Калі яшчэ ўчора раніцай можна было тэарэтызаваць наконт вынікаў канфлікту паміж Вярхоўным Саветам і Прэзідэнтам з выпадку "справы рэдактара "Народнай газеты", дык праз 3 гадзіны пасля пачатку ўчарашняга пасяджэння сітуацыя кардынальна змянілася. Сапраўднага супрацьстаяння ўжо не было, парламенцкая большасць ад барацьбы за рэдактара парламенцкай газеты ўхілілася.

Што ж адбылося такое кардынальнае?

Можна прапанаваць версію, у падмурак якой лягуць такія факты: у панядзелак падчас перапынку Прэзідэнт сустрэўся з дэпутатамі, якія падпісалі пісьмо ў падтрымку рэферэндуму аб двухмоўі і дзяржаўнай сімволіцы, і меў з імі шчырую гаворку. Па-другое, як ён сам сцвярджаў учора з трыбуны Авальнай залы, частцы дэпутатаў была паабяцана дапамога ва ўладкаванні на працу і ў вырашэнні іншых праблем пасля зняцця імі сваіх дэпутацкіх паўнамоцтваў. Калі да гэтага далучыць прапанову парламенту распусціцца, і тое, якія "арганізацыйныя" наступствы мела рэкамендацыя Прэзідэнта выбраць у старшыні Канстытуцыйнага суда Валерыя Ціхіню (напярэдадні "крыніцы" ў парламенце аднагалосна сцвярджалі, што гэтая пасада была цвёрда паабяцана іншаму вядомаму дзеячу), то ўжо напярэдадні галасавання пастановы па "справе Сярэдзіча" можна было прадбачыць яго прынцыповы вынік. Прытым, што ў зале амаль што быў кворум і не было дадзена слова прадстаўніку газеты, атрыманыя 105 галасоў у падтрымку рэдактара "Народнай газеты", — зусім нямала. Але недастаткова.

Пастанову адправілі назад у камісію. На тым і скончыліся спрэчкі: фармальна справа не завершана, пытанне вернута на дапрацоўку, над ім павінны папрацаваць не толькі спецыялісты па галоснасці, але і па заканадаўству. Уражанне такое, што "справу Сярэдзіча" спусцілі на тармазах.

І, канспектыўна, пра іншыя галоўныя падзеі дня. Прамову Прэзідэнта перад парламентам чытачы знойдуць у прэсе, у тым ліку і на старонках нашай газеты (заўтра). Я ж адзначу некалькімі словамі рэакцыю на яе ў парламенце. Парламенцкая большасць сустрэла выступленне Прэзідэнта амаль моўчкі, вельмі ўважліва, меншасць — крытычна, рэдкімі рэплікамі з месцаў, але ў цэлым — стрымана. Частка апазіцыі недзе пад канец прамовы пакінула залу.

У перапынку Аляксандр Лукашэнка доўга і цярпліва адказваў на пытанні журналістаў і нават уступіў у палеміку з дэпутатам Сяргеем Навумчыкам. Пасля абедзеннага перапынку парламент абмяркоўваў магчымыя змяненні ў Законе аб выбарах, сэнс якіх — спроба зрабіць будучыя выбары хоць крыху таннейшымі.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Капыловіча І.І. Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За плённую літаратурную і грамадскую дзейнасць узнагародзіць пісьменніка, заснавальніка рэспубліканскай газеты для інвалідаў "Наша доля" **Капыловіча** Івана Іванавіча Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск N 3652-XII

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Аб назначэнні В.Ф.Некрашэвіча намеснікам міністра па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі Рэспублікі Беларусь

Назначыць Некрашэвіча Васіля Фёдаравіча намеснікам міністра па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.

17 сакавіка 1995 г. г.Мінск. N 111

Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь

Аб назначэнні Г.П.Бадзея міністрам эканомікі Рэспублікі Беларусь

Назначыць Бадзея Георгія Пятровіча міністрам эканомікі Рэспублікі Беларусь, вызваліўшы яго ад пасады міністра па кіраванню дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі Рэспублікі Беларусь.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.ЛУКАШЭНКА.

17 сакавіка 1995 г. г.Мінск. N 112

Приватизировать — так для себя

В конце февраля был подписан приказ Министерства госимущества Республики Беларусь о преобразовании ГПО "Азот" в акционерное общество открытого типа.

Однако на конференции трудового коллектива было принято решение приостановить акционирование. По подсчетам комиссии по приватизации, работники объединения реально смогут выкупить только 3—5 % акций предприятия, в итоге — рискуют потерять контроль над собственной деятельностью. Трудовой коллектив принял обращение к Президенту страны А.Лукашенко, в котором обосновал свое решение несовершенством трудового законодательства Республики Беларусь.

Александр СЕРГЕЕВ.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні групы работнікаў Бабруйскага камбіната нятканых матэрыялаў Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За дасягненне высокіх вытворчых паказчыкаў, важкі асабісты ўклад у развіццё прадпрыемства ўзнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

Архіпенка Марыю Аляксееўну — аператара вязальна-прашывачнага абсталявання.

Гаманькова Леаніда Іванавіча — начальніка электрагаспадаркі.

Казлоўскую Валянціну Іванаўну — швачку.

Ларыкава Ігара Аляксандравіча — дырэктара.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3646-XII

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Дэмскага В.М. і Кліменкі Л.Ф. Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За значны асабісты ўклад у справу сацыяльнай абароны і рэабілітацыі інвалідаў узнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

Дэмскага Валерыя Міхайлавіча — загадчыка аддзела сацыяльнага забеспячэння Ашмянскага райвыканкама.

Кліменку Леаніда Фёдаравіча — начальніка аддзела па справах інвалідаў Міністэрства сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3645-XII

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Котава П.М. Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За значны асабісты ўклад у развіццё вытворчасці ўзнагародзіць дырэктара слонімскай вопытна-эксперыментальнай фабрыкі "Гасцінічная мэбля" **Котава** Пятра Міхайлавіча Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3647-XII

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Жыха Ч.В. Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За шматгадовую плённую гаспадарчую і актыўную грамадскую дзейнасць, значны ўклад у сацыяльна-эканамічнае развіццё сяла ўзнагародзіць старшыню Ленінскага сельскага Савета дэпутатаў Жыткавіцкага раёна **Жыха** Чэслава Вікенцьевіча Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3648-XII

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый замежных краін Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За значны асабісты ўклад у аказанне гуманітарнай дапамогі насельніцтву Беларусі ў пераадоленні вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС узнагародзіць Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь:

Патрыцыю **Дэ Франчэска** — віцэ-прэзідэнта дабрачыннага фонду цэнтральнай школьнай акругі Усходняга Рамапо (г.Спрынг-Вэлі, ЗША).

Жан-Луі **Каленса** — генеральнага сакратара арганізацыі "Французская народная дапамога" Паўночнага дэпартамента Францыі.

Леапольда **Рыхенцкі** — бургамістра г. Штокерау (Аўстрыя).

Фрыдрыха Карла **Фая** — старшыню "Хуткай дапамогі" г. Трыра (Германія).

Курта **Хюрбэ** — адказнага супрацоўніка ўпраўлення справамі ўрада зямлі Ніжняя Аўстрыя.

Хільтруд **Шродэр** — старшыню дабрачыннага фонду зямлі Ніжняя Саксонія (Германія).

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3649-XII

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Бабруйскага камбіната нятканых матэрыялаў Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За значныя поспехі ў развіцці вытворчасці і ў сувязі з 70-годдзем з дня заснавання ўзнагародзіць Бабруйскі камбінат нятканых матэрыялаў Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3650-XII

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Аб узнагароджанні Бажко В.В. Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

За шматгадовую добрасумленную працу, важкі ўклад у развіццё беларускай нацыянальнай архітэктуры ўзнагародзіць дырэктара гродзенскага абласнога праектна-вышукальнага і канструктарска-тэхналагічнага інстытута "Гроднажылпраект" **Бажко** Васіля Васільевіча Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь М.ГРЫБ.

14 сакавіка 1995 г., г.Мінск. N 3651-XI

Народная газета

Ці будзе амністыя?

Пра тое, ці патрэбная яна, наш карэспандэнт гутарыць з начальнікам упраўлення выпраўленчых спраў МУС Беларусі Л.ЦУРКО.

— Леанід Міхайлавіч, колькі цяпер чалавек сядзіць за кратамі?

— Больш як пяцьдзесят тысяч. Гэта амаль у два разы больш, чым дваццаць гадоў назад.

— Якое становішча сёння ў калоніях?

— Даволі няпростае. Каля паловы асуджаных безработныя. Гэта значыць цэлымі днямі без працы. А вал усё новых асуджаных павялічваецца. Калоніі перапоўнены, у некаторых ложкі вымушаны ставіць ужо ў тры ярусы. А медабслугоўванне? Як і чым лячыць скурзахворванні, туберкулёз. Такія ўмовы — гэта дадатковае і, можна сказаць, незаконнае пакаранне для адбываючых зняволенне. Але гэта адбываецца не па наўмыснаму жаданню калоній. Такое, як ні банальна, жыццё. Бо многія і на волі жывуць не лепш і яшчэ вымушаны выдзяляць грошы ў выглядзе падаткаў на харчаванне калоніям.

— У колькі абыходзіцца казне ўтрыманне зняволеных?

— За мінулы студзень гэта сума склала больш як 8 мільярдаў рублёў. Толькі на аднаго асуджанага траціцца амаль 250 тысяч у месяц.

— Калі была апошняя амністыя?

— Больш трох гадоў назад, яшчэ пры былым Саюзе. Тады ў Беларусі было выпушчана на свабоду 157 чалавек. Дарэчы, у ранейшыя часы амністыі праходзілі даволі часта. Як гэта ні высакамоўна гучыць, грамадства павінна не толькі караць, але і ўмець дараваць. А амністыя — гэта шанц, няхай і не для многіх, пачаць новае, больш правільнае жыццё. І ці справядліва мы робім, калі пазбаўляем людзей такой надзеі?

— Хто сёння сядзіць у калоніях?

— Палавіна — за крадзяжы як дзяржмаёмасці, так і асабістай. Многія з іх трапілі за краты ўпершыню. Я не разумею, за што некаторых з іх сюды накіравалі. Напрыклад, А.Цімашэнка асуджаны народным судом Быхаўскага раёна на тры гады пазбаўлення свабоды за крадзеж двух парасят. І падобных выпадкаў нямала. Дык няўжо падобным людзям нельга даць шанц, калі яны яго заслужылі сваімі паводзінамі за кратамі, калі стараліся яго атрымаць?

— А колькі сядзіць рэцыдывістаў?

— Выкажу, магчыма, суб'ектыўную думку, але ў асноўным буйная рыба на свабодзе. Да нас трапляюць часта меншым калібрам. За вымагальніцтва ў нас утрымліваюцца толькі 0,5 працэнта ад усіх асуджаных.

— Ці не атрымаецца так, што пад амністыю могуць трапіць зусім не тыя, дзеля каго яна праводзіцца?

— Не. Возьмем, напрыклад, амністыю 87-га года. Выйшла тады 367 чалавек. Хто гэта? Удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, людзі, якія маюць ордэны і медалі, старыя, жанчыны з дзецьмі. Тут не можа так атрымацца, што мацёры злачынец, якога толькі ізаляцыяй можна абясшкодзіць, раптам выйдзе на волю. Хто цяпер бы трапіў пад амністыю? Асуджаныя, якія былі на вайне ці атрымалі раненні і кантузіі ў час службы, інваліды І і ІІ груп, пенсіянеры і некаторыя іншыя. У першую чаргу пры вырашэнні гэтага пытання звяртаецца ўвага на тое, як паўплывае гэта на крыміногеннае становішча...

— Ці многія пасля амністыі вяртаюцца да свайго ранейшага рамяства?

— Статыстыка ў былым Саюзе сведчыла, што рэцыдыў — 5 працэнтаў.

— Але калі будзе першая амністыя ў нашай рэспубліцы? Да 50-годдзя Перамогі?

— На жаль, адказаць не магу. Пакуль што Вярхоўны Савет адхіляе ўсе падобныя прапановы. Магчыма, нехта думае, што з калоній паваляць тысячамі і тады са злачыннасцю не справіцца. Але гэта зусім не так. Выйдуць нямногія. Але тут нават хутчэй за ўсё чыста псіхалагічны аспект — усім ім дасца шанц. І калі не ў гэты, то ў наступны раз. Ёсць права выбару. Сёння, на жаль, як бы ты сябе ні паводзіў у калоніі — перспектыва маленькая выйсці раней тэрміну. Дык каго мы выхоўваем або перавыхоўваем?

Уточнение

В материале "Что наша жизнь? Дурдом?..", опубликованном в "Народной газете" за 18—20 марта, допущена неточность. Во втором абзаце следует читать "Олегу Владиславовичу Лисковскому".

Аўтабіяэкалагічныя прытчы Анатоля Казловіча

Беларусы паміж небам і зямлёй

Прытча 21. Як пачуваецца чалавеку, якога ненавідзяць

Першая мая нянавісць, як я расказваў, насіла рысы грамадзянскай вайны. Я ледзь не распачаў яе ў Горску напрыканцы пяцідзесятых гадоў дваццатага стагоддзя. І ўсё з-за таго ж брыгадзіра А.

Ён некалькі гадоў душыў нашу сям'ю (і некалькі іншых) тым, што не даваў гарода і сенакосу. Дзякуй Богу, "меліярацыя" тады яшчэ не паспела зруйнаваць наваколле, мы знаходзілі патаемныя лужкі, пра якія брыгадзір, чалавек не тутэйшы, не ведаў. Маці і бабка жалі траву сярпамі, я вазіў дамоў у мяшку веласіпедам. Акрамя травы мы нарыхтоўвалі карове свірэпу.

Калгас не турбаваўся аб стараворыўных супясчаных землях, якія дзесяцігоддзямі спраўна служылі гаспадарам-аднаасобнікам, а пасля былі ў іх адабраны і абагулены. Замест бульбы і жыта на калгасных палях красавала свірэпа.

Жоўтае мора свірэпы ў зялёных берагах лесу. Гудуць пчолы і авадні. На ўскрайку жоўтага мора — старая жанчына і хлопчык з роварам. Бабка Ганна і я.

Туга напханы мяшок са свірэпай я прывязваў да багажніка, ускокваў на сядло, каціў дахаты. Каціў са страхам, баяўся брыгадзіра. На лясной дарозе я папаўся-такі яму ў лапы. А. заставіў мяне адвязаць мяшок, вытрасці свірэпу ў дарожны пыл.

Ён, задаволены расправай над дванаццацігадовым халопам, сеў на брычку, паехаў. Я лёг ніцма на калючы мох пад нізкаю палескай сасной і выплакаўся. Ад крыўды, абразы, нянавісці.

Сабраў на дарозе свірэпу, запхнуў у мяшок, завёз дамоў, рассцяліў. Наш двор быў засцелены свірэпай. Каб на зіму яна не сапсавалася, трэба было добра высушыць. Падсыхаючы, свірэпа горка пахла. Таму я помню, як пахне калгас.

Калі я вярнуўся да бабы Ганны, яна па мне адразу пазнала, што нешта здарылася. Мяне трэсла ад перажытага. Я паведаміў, што адбылося ў лесе, і сказаў: "Я спалю яго хлеў!!!"

Бабка Ганна нечакана для мяне бухнулася каленьмі ў высокую свірэпу, злажыла далоні, гучна, на ўсё жоўтае мора, сказала малітву: "Гасподзь міласэрны! Даруй згубніку грэх перад дзіцяткам! Даруй, Гасподзь, таму, хто ўстрывожыў злосцю душу гэтую маладзенькую!"

Падняўшыся, бабка абняла мяне, пацалавала, перахрысціла: "Забудзь, Толік, злыя словы свае! Забудзь! Забудзь! Бяры мяшок, бачыш, колькі я нажала, пакуль ты ездзіў".

Брыгадзірскага хлява я не падпаліў. Па сабе ведаю, што ад нянавісці вылечвае толькі адна запаведзь — Забудзь! Брыгадзіра А. як нашага суседа я запрасіў на пахаванне бацькі. Брыгадзіраву дачку ў дзесятым класе праводзіў з танцаў, і пры гэтым яна не казала мне, што яе татка мяне прыб'е.

Калі б людзі помнілі свае крыўды, яны жылі б у несціханым полымі грамадзянскай вайны. Крызіс, які перажывае зараз наша грамадства, узнаўляе, абвастрае даўнія крыўды людзей, назапашвае масу гневу, і яна можа ўзарвацца ў любы момант, для чаго павінен знайсціся самы пакрыўджаны чалавек і паднесці запалку — сваю нянавісць.

Пашкадуйце чалавека, які назапашвае негатыўныя эмоцыі, беражліва носіць у сваёй памяці помсту і пры кожным зручным выпадку помсціць. Пашкадуйце, бо яму цяжка. Але бойцеся яго, ён можа звесці чалавечы род.

Гляньце на яго, ненавісніка, хоць не надта прыемна глядзець у бегатлівыя вочкі. Засмечаная незабытымі крыўдамі, бяднее яго генетычная памяць, якая звязвае чалавека з вадой, зямлёй, сонцам. З жыццём. Таму ён такі мітуслівы, нельга злавіць яго позірк.

У стане нянавісці, па падліках псіхіятраў, адбываецца 15 працэнтаў самагубстваў. Ірвуцца генетычныя карані, якія трымаюць чалавека на гэтым свеце. На тым свеце самагубцам, кажуць, таксама не салодка.

Прырода не ведае, што такое нянавісць, затое ведае, што такое любоў. Чалавек, якім кіруе назапашаная нянавісць, — ненатуральны, ненармальны. Абыходзьце яго бокам, як гэта раблю я, ратуючыся ад яго ненармальнай памяці амаль чвэрць стагоддзя.

14 сакавіка 1973 года я надрукаваў у "Сельской газете" (цяпер "Белорусская нива") артыкул пад назвай "Зачем спрямили Уссу?" Самае балючае пытанне "меліярацыі", як бачыце, ходзіць за мной з камсамольскага ўзросту. Дык навошта спрамілі Усу, Пepaтуць, Валоўку? Няўжо нельга было захаваць іх? Як спалучыць агромністы размах меліярацыйных работ з аховай прыроды? Малады журналіст пайшоў па адказы да вучоных, спецыялістаў.

З прафесійным апломбам мне адказалі, а я занатаваў, што: рэчку трэба закрануць экскаватарам абавязкова, каб паскорыць адток вады з балота, але ваду накіруюць не ў мора, а ў вадасховішча, каб у засуху зноў падаць на поле, і будзе гарантаваны ўраджай, будзе нарэшце накормлены наш народ, таму не трэба баяцца меліярацыі, яе робяць ва ўсім свеце, наша партыя прыняла пастанову і гарантуе ахову прыроды-маці.

Звяртаюся да сваіх апанентаў: пазналі? Гэта ж я цытую вас, сённяшніх, учарашніх, вечных маіх ненавіснікаў. Тады я быў з вамі, бо па-камсамольску бяздумна верыў партыі і дэмагогіі палітызаваных тэхнакратаў. Міністр "меліярацыі" нават пазваніў у рэдакцыю і падзякаваў журналісту за разуменне важнай задачы. І рэчкі не знікнуць, запэўніў міністр, і людзі атрымаюць тысячы гектараў зямлі.

Падзяка міністра цешыла самалюбства нядоўга. Я вёў у газеце пытанні меліярацыі, прападаў на аб'ектах і вельмі хутка ўбачыў, што міністр ілжэ, што айчынная "меліярацыя" вынішчае ўсё жывое, што ваду беззваротна спускаюць у Чорнае мора, што стараворыўныя землі робяцца бясплоднымі пяскамі, а "меліяраваныя" — пылам. Як толькі я стаў пісаць пра тое, што бачыў уласнымі вачамі, міністр і ўся ягоная "вертыкаль" мяне ўзненавідзелі, і да гэтага дня маё прозвішча выклікае ў іх адпаведную рэакцыю.

Казловіч абражае і ненавідзіць меліяратараў. Ну, ачомайцеся, людцы: як жа я магу ненавідзець меліяратараў, калі мой бацька таксама быў меліяратарам, а з ім на адным экскаватары працаваў і я!

Але я разумею апанентаў. Іх рэакцыя адэкватная: я пазбаўляю іх спакойнага жыцця, я — грамадскі кантроль, я — дамоклаў меч крыўдзіцеляў прыроды.

Якаю тут не ад недахопу сціпласці, а таму, што ведаю: мая пазіцыя — пазіцыя тысяч людзей, зразумеўшых, што тая "меліярацыя", якая ў нас праводзіцца, у многіх выпадках нічога ім не дае, а больш адбірае. Лісты аднадумцаў цытаваць тут не буду, бо іх вельмі многа. Буду смела гаварыць: МЫ.

Мы супрацьстаім "меліярацыі" многа гадоў. Мы змаглі стварыць ёй раўнавагу — нашу думку, наша слова. Экалагічны плюралізм — наша заслуга. Ён выратаваў Беларусь ад канчатковага апустыньвання.

Мы дамагліся фармальнай перамогі: "меліярацыя" ў Беларусі спынена. У гэтым нам дапамог эканамічны бардак.

Наша перамога будзе выніковай, калі ў Беларусі пачнецца цывілізаваная меліярацыя (без двукосся). Я не выключаю, што зноў пасябрую з міністрам меліярацыі — і мы забудзем шматгадовую палеміку-вайну. Забудзем! Нам дапаможа наша ласкавая прырода.

Калі вадзе не перашкаджаць, яна пад уздзеяннем вярчэння Зямлі пацячэ не туды, куды направілі "меліяратары", а туды, куды цякла стагоддзі, — паіць жыццё.

Навошта спрамілі Усу, Пepaтуць, Валоўку? — пытаўся я 22 гады назад. Каб накарміць народ — адказваў я тады і гэтак жа адкажу цяпер, бо не магу ўзяць на сябе грэх абвінавачваць меліяратараў у наўмысным забойстве. Рэчкі загубілі па прычыне ідэалагічнага глупства і экалагічнага невуцтва. Хто вінаваты? Мы ўсе, сучаснікі. Выхаванцы штучнай сістэмы, якая адарвалася ад цывілізацыі, пайшла ў іншы бок, адарвала сваіх дзяцей ад свету, назапасіла ў іх зайздрасці да свету, крыўды аднаго да другога.

Хутка будзе чвэрць стагоддзя, як памятлівая нянавісць ходзіць за мной, як смерць. Абаронца рэчкі Валоўкі стаў літаратарам — зашыфрую яго літарай Л. Ён упэўнены, што ягоную рэчку спрамілі пасля майго інтэрв'ю ў "Сельской газете". Як толькі сход ці нарада — ён напагатове з пералікам грахоў Казловіча: 1) знявечыў Валоўку; 2) шальмуе на старонках "ЛГ" беларускую літаратуру; 3) пагарджае беларускай мовай; 4) аднойчы разжаніўся; 5) не адлюстроўвае ў сваіх творах поспехаў БССР, а толькі ачарняе радзіму і землякоў; 6) не разумее палітыкі партыі ў вобласці мастацкай творчасці.

Асаблівым патрыятызмам вызначалася, помню, выступленне Л. на пісьменніцкім з'ездзе, на якім прысутнічаў мой тадышні начальнік, член ЦК КПСС, галоўны рэдактар "ЛГ" А.Чакоўскі. Паслухаўшы прамоўцу, Чакоўскі, пыхкаючы люлькай, павучаў мяне жыць наступным чынам: "Вы, Козлович, — не стратег. Вы знали, что Л. будет уничтожать вас?" — "Знал, Александр Борисович". — "Почему же не подготовили выступающего-защитника?" — "Не подумал". — "Плохо! Вы не политик, а наше дело — политическое".

Стратэгіі мяне навучыла бабка Ганна, баптыстка. Пакайся. Забудзь.

У 1978 годзе ЦК камсамола праводзіў нараду маладых пісьменнікаў у Гародні, на турбазе на Нёмане. Атрымалася, што на беразе ракі аказаліся: я, Л., яшчэ адзін літаратар. Навідавоку вечнай вады, як на спаведзі, я папрасіў у Л. прабачэння за юнацкі грэх, пакаяўся, бо адчуваў і сваю віну за рэчку Валоўку. Мы паціснулі адзін другому рукі. Пасля ўвесь вечар пілі "Каберне".

Ён, на жаль, не прыняў майго пакаяння. Наадварот, да аднаго майго граху пунктуальна дабаўляў новыя. Можа, і запісваў, каб не забыць. Вёў класічны кампрамат.

Чуючы ў чарговым людным месцы гэты кампрамат, я адчуваю на шыі пятлю. Другі канец, адчуваю, трымае ў дужых руках Л., з нянавісцю цягне мяне да ямы, да той самай, дзе я ўпершыню ўбачыў смерць...

Пакуль я жывы, даруйце мне, апаненты, калі я пакрыўдзіў вас рэзкім словам. Затое няма ў мяне да вас помсты. Нікога і ніколі я не хацеў знішчыць.

Нам трэба прадаўжаць жыць, а не душыць адзін другога ў высахлай яміне Беларусь. Трэба хутчэй ажывіць яе боскай вадой. Плаваць жа мы пакуль што не развучыліся. Кожны ў сваёй справе — як рыбка ў вадзе. Вы — працавітыя карасі. Каб жа не задрамалі, я згодны на шчупака.

А ўвогуле я стаміўся ад размовы пра нянавісць. Наступная будзе пра любоў. Гэта будзе заўтра. А каб да заўтра не разарвала ад нянавісці яшчэ аднаго апанента, я спяшаюся выратаваць яго, земляка, малодшага сына глуханямога Васіля Казловіча (памятаеце непахіснага селяніна-аднаасобніка?). Я паспрабую выпусціць з маладога члена ПКБ ідэалагічную пару, пералічыўшы з яго ліста ў рэдакцыю ўсе пункты маёй характарыстыкі, складзенай ім па матывах маёй біяграфіі.

Такім чынам, Анатоль Казловіч з Горска: 1) прапаведуе антыкамунізм, антысаветызм, антырускі настрой; 2) пакланяецца перад прыватнай уласнасцю; 3) гора-журналіст; 4) для яго не існуе ніякіх маральных крытэрыяў і абмежаванняў; 5) у галаве і артыкулах каша замест думак; 6) бервяно ў сваім воку не заўважыць; 7) не разумее таго, пра што піша; 8) выкарыстоўвае нізкія правакацыйныя прыёмы; 9) абразіў горскіх мужчын і "Песняроў"; 10) перараджэнец; 11) пярэварацень; 12) не ведае класікаў і вёскі; 13) не мае права думаць, бачыць і пісаць; 14) прыстасаванец; 15) дэмакрат; 16) бээнэфавец; 17) кан'юнктуршчык; 18) ненавіснік Беларусі; 19) пустабрэх; 20) хітрэц; 21) паскуднік; 22) зводнік; 23) "интеллектуальная шавка".

З улікам кампрамату літаратара Л. будзе 29 пунктаў. Здаецца, навесіць больш на адну асобу — немагчыма. Ды не! Тры камуністы з Пастаўскага раёна (Сцепаненка, Пабедзінскі, Дзёмін) падумалі, параіліся, паведамілі ў рэдакцыю, што Казловіч "зачат искусственно от спермы бешеного быка". Свой прысуд тройка накіравала ў Вярхоўны Савет з патрабаваннем "принять меры".

НАШИ ДЕТИ В ПОГОНАХ

Армейская баранка

Сергей КРАПИВИН

Военнослужащий или занимается своим прямым делом, или вынужденно обеспечивает себе существование. В последнем случае он, правда, уже не военнослужащий... Как живет сегодня обыкновенная воинская часть?

"На Беларусі тры сталіцы: Мінск, Бабруйск і Плешчаніцы" — такое есть присловье. В одном из столичных гарнизонов довелось побывать минувшей зимой. Представляет его бригада, где перед плацем на постаменте возвышается памятником фронтовая полуторка. А если обратить внимание на то, что маршируют по плацу сплошь молодые солдаты, то нетрудно догадаться, что эта бригада — учебная. "Автомобильная учебка" — называют ее просто в войсках.




Фото Сергея ГРИЦА.

Сотни машин и сотни парней — недавних призывников, из которых за полгода нужно сделать классных военных водителей. Какова в этой части отдача человекодня?

Я не военный политолог и экономист, но как бывший взводный могу достаточно квалифицированно поддерживать беседу на темы сапог, сухарей, солярки. Знаю также толк в способах отдачи бойцов в рабство сторонним организациям с тем, чтобы в качестве натурплаты получать, например, нитролак и этим лаком затем покрывать декоративные валуны перед зданием штаба. И когда смотрю на вывешенное в казарме расписание занятий, то привычно сомневаюсь: а не туфта ли это?..

— Если бы и захотелось нашим командирам вот так запросто выдернуть солдата из учебного класса, с автодрома и послать его куда-то чего-то ради, то вначале пришлось бы крепко подумать, — говорит командир бригады полковник Дмитрий Плеганский. — Валуны перед штабом у нас не покрыты лаком потому, что начальник автослужбы белорусского войска полковник Жеребцов имеет обычай по приезде в часть садиться в кабину учебного грузовика рядом с курсантом и задавать там вопросы один на один: "Что же ты, сынок: месяц отучился, а ездишь — нога прямая, глаза квадратные. Пропуски занятий были?.. По какой причине?.." Служба в бригаде — как конкретное производство. Причем, результаты нашего труда оценивают не армейцы же, а сотрудники госавтоинспекции. Милиции нет резона выпускать на общегражданскую трассу плохо подготовленого водителя, который не прошел все учебные классы, не откатал нужного количества часов и километров...

Характеристика для армейского подразделениияи не самая показательная, но бригада полковника Плеганского — та воинская часть, которая считай что напрямую работает на экономику страны. Готовят здесь, к примеру, водителей категории "Е". Профессионалы знают, что это достаточно редкий и потому ценный допуск к управлению тяжелыми крупногабаритными тягачами. Для гражданской организации подготовка такого водителя стоит очень больших денег. А воинская часть, дав квалификацию, обеспечивает молодого человека верным заработком на всю дальнейшую его жизнь.

...Заместителя командира бригады по воспитательной работе подполковника Николая Луцевича только что покинули посетители — солдат вместе с матерью. После их ухода на столе остался листок: "Я, рядовой З..., в присутствии своей мамы обещаю служить честно, не допускать никаких недобросовестных поступков".

— Да, со стороны выглядит забавным: у защитника Родины вызвали родителей, словно у нашкодившего школяра. Но так даем шанс исправить себя до визита в военную прокуратуру. Не армия научила этого молодого человека кушать водочку, а потом куражиться перед сверстниками. Но почему тогда воинский коллектив должен страдать от шлейфа вредных привычек? По мне, так хоть каждую неделю родительские собрания устраивать бы. Приезжают в часть старшие родственники солдат — и замечательно. Родители плохому не научат. А вот с прежними друзьями-приятелями новобранцев нередки проблемы: везут спиртное, подбивают на самоволку... Сокращение должностей офицеров-воспитателей — прежних замполитов в ротном звене считаю большой ошибкой. На примере нашей учебной части, где в роте до восьмидесяти молодых солдат, это особенно ощутимо. Вот и думаем, как дойти до каждого, не потерять человека в массе. Успеваем не всюду, но есть, например, в бригаде внутренний телефонный номер, который военнослужащие при необходимости могут набрать анонимно, — своего рода телефон доверия. Этот номер лично мой: 1-23.

Бытует черноватая казарменная шутка: "В армии не бывает больных, в армии бывают *живые и мертвые*". Но парадокс наших дней таков, что как раз в армии и проще всего воспользоваться услугами медицины. Начальник медслужбы бригады майор Сергей Новиков показал мне свои аптечные запасы. В них — те медпрепараты, которых в обычных аптеках давно не сыщешь.

— Грешно похваляться перед гражданскими коллегами, но, случается, поселковую больницу в Плещеницах мы выручаем, — говорит военврач. — Проблема в другом: призывные комиссии нередко поставляют армии заведомо больных людей. В прошлом году мы вчистую уволили 47 солдат и сержантов, из них 42 — по болезням, полученным до армии. Ну, скажите, на каком месте находятся глаза и уши у тех военкоматских чиновников, которые сказали "годен" человеку с врожденной деформацией грудной клетки или с заиканием, охватывающим весь речевой аппарат?..

На тысячу с лишним народу есть в бригаде больничный стационар на 20 коек. В день нашего посещения заняты были две. Один солдат лежал с простудой, другой — из-за того, что до безобразия натер ногу скверной обувью.

Обойдусь без расхожей сентенции о якобы маменькиных сынках, которые-де не умеют носить кирзовые сапоги. Попробуем о другом задуматься: с какой это стати современный молодой человек должен быть ориентирован на кирзу — эрзац из 30-х годов? Слава богу, пережили нищету военного времени, но отчего спартанские самоограничения остались прежними? Вчера хлопец отвечал только за себя и носил "Белвест" из натуральной кожи с мехом, а сегодня, когда доверена техника на многие и многие миллионы (да, в конце концов, Родину защищать доверено!), личный комфорт ему противопоказан.

Почему? Чтобы служба медом не казалась? Но, думается, не на заведомых лишениях зиждутся строгость и порядок в службе. И не то самое примечательное в армиях стран НАТО, что у солдата имеется 11 вариантов униформы, а то, что одевают там рядового и генерала одинаково, лишь знаки воинского различия у каждого свои.

Вот какую крамолу я сею, но подобные мысли неизбежны, когда видишь, что солдатскую молодежь обувают в кирзачи второй категории — головки новые, голенища старые. У этих сапог, рассчитанных на четыре месяца носки, подметки отваливаются уже через две недели, — сообщил с полным знанием дела начальник вещевой службы майор Олег Галдович. Вот и стучит день и ночь молотком в бригадной мастерской вольнонаемный старик-сапожник.

И чем стирать форменное хабэ (на самом деле — хлопок пополам с лавсаном)? Положенных сорока двух килограммов стирального порошка на тонну одежды здесь давно уже не видели. А резаным хозяйственным мылом шоферская одежда не очень-то отстирывается.

Молодые солдаты, с которыми потолковал о впечатлениях первых месяцев службы, сравнивать свою бригаду с какой-либо иной воинской частью, естественно, не могут. Я же для себя отметил: нормальный армейский коллектив. Нормальный в том смысле, что хорошо бы всем приблизиться к уровню его организации, к качеству командования. Я не видел здесь в массе солдатских лиц, на которых были бы написаны затравленность, отупелость, ожесточенность. Не встретил и офицеров и прапорщиков с универсальной реакцией на все обстоятельства службы: "А гори оно гаром..." (Фактор, впрочем, есть немаловажный: после недавней сдачи 60-квартирного жилого дома в части практически не осталось бесквартирных командиров.)

Свойство военных-технарей в том, что им нет нужды постоянно напыживать грудь, заниматься *показом* службы. Им бы просто — по норме топлива, да запчастей, да сапог с говядиной. И еще — чтобы никто не дергал разными показухами. Тогда они и зиму переживут, и дадут стране специалистов. Будь моя воля — все бы белорусское войско превратил бы в такую "учебку", как у полковника Плеганского из столичных Плещениц.

Письмо, которое нас взволновало...

В глазу уже "летает" черная муха

"Уважаемая редакция!

Обращаюсь с большой просьбой — посоветуйте, как и чем мне лечить глаза? Они гноятся, слезятся, их затягивает пленкой. В одном глазу "летает" черная муха. Зрение падает. Беда, да и только. И не к кому обратиться за помощью. В Кличевском районе, где я проживаю, нет врача-специалиста. Чтобы записаться на прием к окулисту, нужно ехать в соседний районный центр Бобруйск или Могилев. А это не близкая дорога. К тому же я уже в возрасте — мне 69 лет, инвалид 2-й группы. Как быть?"

Вот такое письмо редакция получила от Анастасии Ефимовны Гущи.

Чтобы прояснить ситуацию, мы позвонили в Кличевскую районную поликлинику. Ответила заведующая Валентина Николаевна Юшкевич.

— Действительно, в районе нет офтальмолога вот уже почти три года. Почему? Никто к нам не хочет ехать. Давали объявление в прессе, но оно так и осталось никем не замеченным. Может, вы пришлете врача-специалиста? — спросила она в сердцах.

К сожалению, редакция такими кадрами не располагает. Зато нас утешил начальник управления здравоохранения Могилевского облисполкома Владимир Васильевич Мартыновский, которому мы позвонили и рассказали о поступившем в редакцию письме.

— Да, в Кличеве пока нет офтальмолога, — подтвердил он. — С распределением кадров обстановка в настоящее время такова, что мы не можем волевым решением направить молодого специалиста на работу туда, куда он не хочет ехать. Но могу вас заверить, что в этом году врач в Кличевской поликлинике будет. Уже есть договоренность.

Когда это произойдет? К концу года? А как быть в настоящее время тем людям, кто нуждается в помощи окулиста? **Может, кто-нибудь изъявит желание теперь поехать на работу в Кличев? Если да, тогда звоните в Могилев Владимиру Васильевичу Мартыновскому по телефону 25-63-55.**

Николай ЦАПОВ.

Что посеешь?

Специалисты Витебской областной госсеминспекции завершили проверку семян зерновых и зернобобовых культур.

98% семян признаны кондиционными к весенней посевной. Из них 57% отнесены к первому классу. Хозяйства Браславского, Шарковщинского и Лепельского районов практически полностью обеспечили себя семенами высшего качества. А вот в Городокском районе из 20 колхозов и совхозов ни один не имеет семян первого класса.

Владимир ШИК.

Павел СТАСЕВИЧ

НОВЫЕ ЛЮДИ

Виктор ВЕРЕМЕЙЧИК:

"Я стал рыночным "волком", чтобы нас не "съело" государство..."

Портрет удачливого председателя колхоза на фоне смутного времени

